ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 60 (1329) | СУБОТА, 14-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Камсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага № —2 кап.

Адчыніўся II пленум ЦК ЛКСМБ

Другі пленум ЦК ЛКСМБ распачаў сваю працу ўчора а 6 гадзіне ўвечары.

З дакладам аб рабочым забясьпечаньні і ўдзеле комсамолу выступіў сакратар ЦК ЛКСМБ т. Гуткін.

Па дакладу разгарнуліся спрэчкі.

Сёньня пленум пачынае працу а 10 гадзіне раніцы. На ранішнім паседжаньні будзе працяг спрэчак па дакладу.

VI Усесаюзны Зьезд Саветаў

„Мы ідзем у ногу з усім Савецкім Саюзам“

З прамовы старшыні СНК БССР тав. Галадзеда

Хара-тэрнай рысай сучасных між-ародных абставін зьяўляецца факт ..вага ажыўлен ня антысавецкага ..каваньня як з боку ўсяго буржуаз-..га друку, так і з боку буржуазных ..літыкаў. Я хачу застанавіцца толькі ..а тым, якую ролю ў гэтай антыса-..цкай сьвістаплясцы адыгрывае Поль-..ча.

Польшча якая, выконваючы сацы-..льны заказ заходня-эўропэйскіх ка-..італістых, так заядла выступае су-..роць савецкага экспорту пад сьцягам ..араньбы з савецкім „дэмпінгам“.

Польшчы належыць першае месца ..арод „дэмпінгавых“ краін. Вось факт: ..Польшчы больш 70 проц. усяго ..кспорту дэмпіруецца Яшчэ ў жніўн ..930 году польскі кон'юнктурны часо-..іс „Экономісты“ пісаў, што за сем ..есяцаў 1930 году з польскага бюджэ-..у трэба ўзяць больш 50 мільёнаў ..лотых для аплаты так званых экспорт-..ых прэмій. Цкаваньне савецкага ..спорту, якое так старанна разгор-..ваецца ў польскай прэсе пад сьцягам ..арацьбы з „савецкім дэмпінгам“,—..эта дымавая заслона падрыхтоўцы ..зброенага нападу на Савецкі Саюз.

А як стаіць справа з паклёпамі ..ольскай буржуазнай прэсы і некато-..ых „палітыкаў“ па пытаньню аб на-..цыянальнай палітыцы савецкай улады?

У гэтых адносінах справа даходзіць ..а бульварных выдумак.

Няўжо невядома ўсяму сьвету аб ..ьвярыных катаваньнях у польскай ..оліцыі працоўных беларусаў у Заход-..няй Беларусі, працоўных украінцаў ..Заходняй Украіне?

Усяму сьвету вядома, што бізуны ..уляюць па сьпінах украінцаў і бела-..русаў, што мільёны гніюць у засьцен-..ках фашысцкіх турмаў толькі за тое, ..што працоўныя беларусы і украінцы ..адстойваюць свае элемэнтарныя правы, ..жадаючы гаварыць і вучыцца на род-..най мове. Усім вядомы факты закап-..ваньня ў зямлю беларускіх дзяўчат. Вось вам нацпалітыка ў выданьні фа-..шыстых.

Як-жа стаіць справа з вырашэнь-..ем нацпытаньня ў Савецкім Саюзе: Каму невядома, што народны СССР—..у мінулым прыгнечаныя, бясправўныя ..нацыянальнасьці—нязьмерна шпаркі-..мі тэмпамі будуюць соцыялістычную ..экономіку і культуру. Наша бальша-..віцкая партыя, пад кіраўніцтвам свай-..го Цэнтральнага Камітэту і тав. Ста-..ліна, змагаючыся на два фронты—з вя-..лікадзяржаўным расійскім шовінізмам, ..як асноўнай небясьпекай на даным ..этапе, і ўхіламі ў б к мясцовага на-..цыяналізму, праводзіць ад пачатку да ..канца правільную палітыку ў нацы-..янальным пытаньні, па-ленінску яго ..вырашаючы.

Мы ідзем у ногу з усім Савецкім Саюзам па шляху соцыялістычнага бу-..даўніцтва. Капітальныя ўкладаньні ў ..прамысловасьць Беларусі за тры гады ..пяцігодкі складаюць 179 мільёнаў руб-..лёў, ці каля 75 проц. усіх капітальн-..ых укладаньняў за пяцігодзьдзе. Зна-..чыцца, выкананьне лёзунгу „Пяцігод-..ка—у чатыры гады, поўнасьцю за-..бясьпечана.

На аснове росту прамысловасьці і ..ўсяе народнае гаспадаркі шпарка рас-..туць пролетарскія кадры. Калі ўзяць ..усіх рабочых (разам з транспортнымі, ..будаўнічымі і г. д.), то атрымліваецца ..наступны малюнак: паводле пяцігодкі ..намячаўся прырост да 366.300 чалавек, ..а на самай справе ўжо ў 1931 годзе, ..будзе 461.700 чалавек. Дасягненьні ..ў сельскай гаспадарцы азначаюцца тым, ..што больш 20 процантаў бядняцка-се-..радняцкіх гаспадарак ужо аб'ядналіся ..ў колгасы. У гэтым годзе організу-..ецца ў БССР 25 машына-трактарных ..станцый, растуць і мацнеюць жывёла-..гадоўчыя, ільняныя саўгасы і колгасы, ..растуць нацыянальныя колгасы—поль-..скія, яўрэйскія, латыскія, літоўскія. 70 тысяч працоўнага яўрэйскага на-..сельніцтва перайшлі на сельска-гас-..падарчую працу, аб'яднаўшыся ў кол-..гасы. Капітальныя ўкладаньні ў сель-..скую гаспадарку БССР у 1931 годзе ..раўняюцца 169 мільёнам рублёў.

А там у Заходняй Беларусі, беларускі селянін стогне пад ботам поль-скага фашызму, пад цяжарам падат-каў, галадае і церпіць галечу.

Дасягненьні ў галіне нацыянальнай культуры характарызуюцца наступнымі фактамі: яшчэ ў мінулым годзе быў уведзены ў БССР і вось ужо другі год ажыцьцяўляецца плян усеагульнага абавязковага навучаньня, пасьпяхова ліквідуецца няпісьменнасьць дарослага насельніцтва. Узрасла сетка ВНУ і ВТНУ. Пры дапамозе ўраду Саюзу пабудован у Менску унівэрсытэцкі гарадок.

Пяцігодкай вызначалася друкаваньне літаратуры на нацыянальных мовах, галоўным чынам беларускай, у аб'еме 192,7 млн. аркушаў адбіткаў, а мы ўжо ў гэтым годзе выканаем 167 4 млн. або выканаем пяцігодку на 87 проц.; а газэты меркавалася друкаваць за апошні год пяцігодкі ў колькасьці 248,6 млн. экзэмпляраў, на самой-жа справе ўжо ў 1931 г. будзе выпушчана 236,3 млн. экз, ці 95 проц. усяго пляну пяцігодкі.

А якія культуры нацыянальных меншасьцяй разьвіваюцца ў Польшчы? Там закрываюць беларускія школы. Затое адкрылі духоўную сэмінарыю толькі для абслугоўваньня, як яны пішуць аб гэтым у сваіх газэтах,—праваслаўнага народу. Значыць, выпускаюць папоў—служак фашызму.



Толькі дзякуючы систэматычнай дапамозе ўсяго Саюзу, мы дабіліся такіх посьпехаў. З прыведзеных фактаў відаць, як наша партыя і савецкая ўлада вырашаюць нацыянальнае пытаньне. Толькі ленінская партыя на чале са Сталіным і савецкая ўлада правільна вырашылі нацыянальнае пытаньне.

Чаму-ж польскі друк, ня гледзячы на відавочную моц пададзеных фактаў, усё-ж займаецца такім нябачаным паклёпам на нас? Гэта тлумачыцца ў першую чаргу тым, што фашысцкай буржуазіі трэба замазаць, апраўдаць свае зьверствы над мільёнамі працоўных беларусаў, украінцаў і яўрэяў. Няма чаго гаварыць аб тым, што ваенная падрыхтоўка у Польшчы вядзецца найбольш інтэнсыўным тэмпам, чым у іншых капіталістычных дзяржавах, пры поўным падтрыманьні гэтых дзяржаў і пад іх контролем.

Таму рабочая кляса, колгасьнікі і ўсё працоўнае сялянства БССР усю сваю работу па соцыялістычнай будоўлі цалкам і поўнасьцю ў першую чаргу ўвязвае з узмацненьнем абароназдольнясьці нашага Савецкага Саюзу, штодзенным умацаваньнем магутнасьці нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Клясавая барацьба ва ўмовах беларускай савецкай нацыянальнай рэспублікі, маючы агульныя карэньні, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, у радзе выпадкаў набывала свае спэцыфічныя характэрныя нацыянальнай рэспубліцы формы. Клясавы вораг часта прыкрываецца нацыянальнай вуальлю.

Мы за мінулы год мелі факты праяўленьня яраснага супраціўленьня соцыялістычным мерапрыемствам з боку беларускіх нацыянал-дэмократаў. Дзейнасьць контррэволюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмократаў дайшла да таго, што яны ўстанавілі сувязь з польскімі фашыстымі, мелі сувязь з Рамзінымі, Кандрацьевымі, Громанамі і ў надзеі на ваенную інтэрвэнцыю з боку капіталістычнага Захаду, ўжо падрыхтавалі свой „урад“.

Мы будуем соцыялізм і нікому не дазволім парушаць гэта будаўніцтва,—гаворыць у заключэньне тав. Галадзед. Калі капіталістыя паспрабуюць зачапіць нас штыхом з Захаду, як яны спрабавалі гэта зрабіць у 1929 годзе з Усходу, дык іх чакае той-жа лёс, што і на Ўсходзе: яны паломяць свае штыхі.

Мала высунуць ідэю, трэба дапамагчы ажыцьцявіць яе

На передавыя позыцыі рэконструкцыі

ПРОГРАМА ДЗЕЯНЬНЯЎ „ЧЫРВОНАЗЬМЕНАЎСКІХ“ СПЭЦЫЯЛІЗАВАНЫХ БРЫГАД

З мэтай організаваць актыўнасьць мас комсамольцаў, колгасьнікаў бядняцкоў і серадняцкоў, аднаасобнікаў на пасьпяховае выкананьне плянаў рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і яе спэцыялізацыю. з мэтай мобілізаваць іх ўвагу і актыўнасьць на барацьбу за вядучыя экономічна карысныя высока-таварныя культуры і галіны сельскай гаспадаркі: лён, канаплю, жывёлагадоўлю, сьвінагадоўлю. садоўніцтва і гародніцтва,—газэта „Чырвоная Зьмена“ накіроўвае у тры адстаючыя раёны спэцыялізаваныя брыгады.

Брыгады выедуць: у Лёзьненскі раён па тэхнічным культурам Лельчыцкі— па жывёлагадоўлі і Гомельскі —па садагародніцтву.

Уся практычная дзейнасьць спэцыялісаваных брыгад будзе накіравана на пасьпяховае разгортваньне колектывізацыі спэцыялізаваных раёнаў на практычную дапамогу комсамольскім організацыям пабудаваць сваю працу адпаведна з задачамі, якія стаяць перад комсамолам ў другую бальшавіцкую вясну.

Брыгада па тэхнічных культурах

Дапаможа раённаму камітэту комсамолу скласьці плян конкрэтнай дзейнасьці ў барацьбе за разьвіцьцё гаспадаркі тэхнічныя культур.

Забяспечыць 100 проц. выкананьне пляну загатовак лёну і канапель, улічыць унутраныя рэсурсы раёну і організаваць працу ў комсамольскіх ячэйках, сярод колгасьнікаў і рабочых саўгасаў па складаньню сустрэчных плянаў для пашырэньня пасеўплошчы лёну і канапель і поўнай контрактацыі пасеўплошчы і тэхнічных культур.

Забясьпечыць 100 проц. выкананьне пляну загатовач насеньня тэхнічных культур, скласьці насенныя фонды і пляны рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара.

Організаваць кантроль комсамолу над ходам будаўніцтва заводаў па першапачатковай пераапрацоўцы лёну і канапель.

Брыгада выпусьціць спэцыяльныя лістоўкі паходу ЛКСМБ за разьвіцьцё лёну і канапель. у якіх вызначыць конкрэтныя задачы ў галіне разьвіцьця лёнаканаплявoдчых гаспадарак у раёне.

Брыгада па жывёлагадоўлі

Разам з Райкомам комсамолу складзе плян конкрэтнай дзейнасьці комсамольскай організацыі ў барацьбе за разьвіцьцё жывёлагадоўчай гаспадаркі.

Організуе паход комсамольскай організацыі за 100 проц. выкананьне пляну мяса загатовак, контрактацыі буйнай рагатай жывёлы, маладняка і захаваньня ўсяго прыплоду маладняка буйнай рагатай жывёлы і сьвіней.

Возьме кантроль і практычна дапаможа выканаць пляны будаўніцтва сьвінарнікаў і хлявоў для буйнай рагатай жывёлы, забясьпечыўшы 100 проц. выкананьне плянаў будаўніцтва.

Праз організацыю спэцыяльных комсамольскіх і маладзежных брыгад па барацьбе за рацыянальнае выкарыстаньне корму і пашырэньне плошчы пасеву кармовых траў і сілосных культур, забясьпечыць загатоўку фуражу на час вясеньняй пасеўкампаніі і падвядзе кармовую базу адпаведна з патрэбаю жывёлагадоўчай гаспадаркі ў корме.

Забясьпечыць максымальнае разгортваньне сілоснага будаўніцтва.

Шырока організуе працу па барацьбе супроць эпізоотыі, за ўкараненьне ў шырокія колы колгасьнікаў і аднаасобнікаў зоовэтмінімуму.

Выпусьціць лістоўкі з маршрутамі баявых дзеяньняў комсамолу.

Брыгада па сада-агародніцтву

Сумесна з Райкомам ЛКСМБ складзе плян конкрэтнай дзейнасьці комсамолу ў барацьбе за разьвіцьцё сада--гароднае гаспадаркі раёну.

Організуе сустрэчныя пляны па максымальнаму пашырэньню пасеўплошчы пад садамі, гародамі і парніковай гаспадаркай.

Організуе кантроль комсамольскіх організацый над ходам будаўніцтва садова-гародных гаспадарак.

Дапаможа гаспадарчым, кооперацыйным і комсамольскім організацыям вышукаць на мясцох крыніцы для забясьпечаньня садова-гародніцкіх гаспадарак працоўнай і цяглавай сілай.

Забясьпечыць выкананьне ўсіх відаў працы, зьвязаных з падрыхтоўкай да вясеньняй пасеўкампаніі ў прыгарадных гаспадарках.

Організуе работу па максымальнаму выкананьню пляну загатоўкі насенных фондаў для прыгарадных гаспадарак на мясцовым рынку.

Выпусьціць лістоўкі з паказаньнем маршрутаў паходу комсамолу ў барацьбе за разьвіцьцё садова-гародных гаспадарак.

***

Правядзеньне гэтых мерапрыемстваў павінна забясьпечыць ліквідацыю прарываў, якія ёсьць у працы гэтых трох раёнаў па спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі і падцягнуць іх да перадавых. Разам з гэтым, на вопыце іх практычнай дзейнасьці, трэба навучыць іншыя комсамольскія організацыі, як змагацца і перамагаць.

Задача комсамольскіх організацый Лельчыцкага, Лёзьненскага і Гомельскага райкомаў, куды накіроўваюцца спэцыялізаваныя брыгады „Чырвонай Зьмены“,—аказаць ім штодзённую практычную дапамогу ў працы, мобілізаваць на дапамогу ім усю комсамольскую організацыю, шырокія колы рабочай, колгаснай, батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі.

Соцспаборніцтва з Украінай

ВЫКАНАЦЬ БАЛЬШАВІЦКІЯ АБАВЯЗКІ

ФІНПЛЯН—БАЯВЫ ВУЧАСТАК БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Комсамол—шэф ашчадкас—павінен прыкласьці ўсе сілы, каб ліквідаваць прарывы на гэтым фронце

На 1-е сакавіка гэтага году фінплян выкананы толькі на 44 проц.

Весткі з месц сыгналізуюць аб тым, што апошвія дні таксама пералому ня далі.

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) завастрыў увагу па важнасьці фінансавага пляну, які зьяўляецца рашаючым вучасткам у барацьбе за выкананьне кантрольных лічбаў 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Уступаючы ў 3-ці год пяцігодкі, беларускі комсамол склаў соц. умову з Украінай, выклікаўшы яе на соц. спаборніцтва. Аднак рад комсамольскіх організацый ня выконвае ўзятых на сябе абавязкаў.

Побач з бязумоўна вялікімі дасягненьнямі паасобныя комсамольскія організацыі яўна ігнаруюць умову ня хочуць прыкласьці сілы, каб выканаць фінплян.

Шмат комсамольцаў кінута на працу ў ашчадны апарат. Мы лічым, што неабходна правесьці праверку іх дзейнасьці і барацьбы за выкананьне фінансавых плянаў.

Мы абвяшчаем пераклічку комсамольцаў, якія працуюць у ашчадным апараце з тым, каб высьветліць як пастаўлена праца ў ашчадапараце і дзейнасьць комсамолу ў барацьбе за выкананьне фінпляну.

Мы чакаем водгукаў комсамольцаў з ашчадапарату, чакаем, што яны раскажуць аб сваёй працы і барацьбе, унясуць свае прапановы для лепшай організацыі працы.

Фінплян павінен быць перавыкананы.

Рэйд комсамольскіх брыгад

Ашчадкасы Менску не працуюць баявымі тэмпамі



Даць сводкі на машыны

Камісія па чыстцы ашчадкас, разам з групай „лёгкай кавалерыі" ячэйкі ашчадкас і фінкурсаў, організавала налёт на ашчадкасы і грамадзкія організацыі з мэтай праверыць, як яны працуюць і які ўдзел у іхняй працы прымае грамадзкасьць.

Данясеньні брыгадзіраў сьведчаць аб тым, што ашчадны апарат не перабудаваўся на баявыя тэмпы, не мобілізавана грамадзкасьць ашчадкас на выкананьне фінпляну, бязьдзейнічае і камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе. Фабзаўкомы і ячэйкі зусім ня цікавяцца ашчадсправай.

Менгарашчадкаса за асобны квартал толькі на 0,60 проц. выканала фінплян па фізычных укладах. Рэалізацыя швэйных машын праходзіць марудна. З 1250 швэйных машын, рэалізавана толькі 870.

Вельмі слаба разьвіваюцца безнаяўныя разьлікі. За студзень месяц заданьне выканана толькі на 30 проц.

Справаздачнасьць і зьвесткі прадстаўляюцца са значным спазьненьнем.

У ашчадапараце занядала соц. спаборніцтва і ўдарніцтва. Ніхто ні разу не праверыў, як выконваецца соц. умова, складзеная з Віцебскай гаркасай. Ды і праверыць гэтага нельга, бо соц. умова недзе загубілася, прынамсі ў справах МК яе няма.

На прадпрыемствах неўпарадкавана праца разьліковых кас. Працаўнікам гэтых кас ніхто не дапамагае, вопыт іхняй працы ня ўлічваецца. Няма кіраўніцтва і інструктажу нізавых кас, агентаў і ўпаўнаважаных.

На швэйнай фабрыцы „Кастрычнік" камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе фактычна ня існуе. Намесьнік старшыні фабкому, тав. Губэрштэйн, заявіў, што камсод распаўся і таму ніякай працы не праводзіцца. Партколектыў і фабком не паклапаціліся аб тым, каб наладзіць працу камсоду.

У Менскіх ашчадкасах аб соц. спаборніцтве шмат гавораць. Але што робіцца? Кіраўніцтва і гаркаса ў свой час склала соц. умовы з ЗСФСР і Віцебскай гаркасай, але ні першая, ні другая ўмова ня выкананы. Яны памерлі, не пасьпеўшы нарадзіцца.

Да вылучэнцаў адносіны дрэнныя. Старыя працаўнікі, альбо як іх называюць „прапаленыя спэцы" ня хочуць ім дапамагаць. Растлумачальна-выхаваўчая праца сярод супрацоўнікаў не вядзецца. У касах шырока разьвіты старыя традыцыі, паклёпы, плёткі, шушуканьні па кутках, замест здаровай бальшавіцкай самакрытыкі. Наглядаюцца і контррэволюцыйныя настроі. Возьмем прыклад. Жонка супрацоўніка Хітро о ў прыватных гутарках і на агульных сходах гаворыць, што „усе комуністыя сволачы", што „забіць іх усіх трэба", што „мярзавец на мярзаўцу сядзіць і мярзаўцам паганяе". Характэрна, што гэтым махровым контрэволюцыйным „тэорыям" адпору не далі. Гэтага пытаньня ніхто не завастрыў.

Выяўленыя налётам факты гавораць самі за сябе.

Горкамсод павінен ужыць усе меры, каб ажыцьцявіць працу нізавых камісій садзейнічаньня. Улічваючы бязьдзейнасьць камсоду фабрыкі „Кастрычнік" і не здавальняючае становішча мобілізацыі сродкаў на фабрыцы, трэба організаваць над камсодам грамадзкі суд.

Савецкі і Ш.

Змагаемся за фінплян

Уступаючы ў спаборніцтва з Віцебскім комсамолам, Менскі комсамол узяўся забясьпечыць поўнае выкананьне контрольных лічбаў па ўкладах у ашчадкасы, прычым Гарком высунуў сустрэчны фінплян з 480.000 да 600.000 руб. Кантрольныя лічбы разьмеркаваны па ячэйках, паасобныя ячэйкі ўжо прыступілі да працы. Так, комсамольскі колектыў заводу „Энэргія" ўцягнуў 400 укладчыкаў на 7.200 р. Ячэйка высунула сустрэчны фінплян, павялічыўшы кантрольную лічбу на 15.000 р. і ўзяла на буксір комсамольскі колектыў з-ду „Бальшавік".

Гарком вылучыў 50 комсамольцаў-брыгадзіраў, якія прымацаваны да буйных колектываў гораду дапамагаць у працы ячэек і грамадзкасьці прадпрыемстваў па ўдзелу ў развіцьці ашчадсправы.

У Менску адчынена новае комсамольскае аддзяленьне ашчадкасы імя 10 зьезду ЛКСМБ, над якім узяў шэфства комсамол з-ду „Беларусь".

25-га лютага быў організаваны ўрачысты вечар з прычыны адчыненьня комсамольскай ашчадкасы і прыняцьця над ёю шэфства.

Гарком накіроўвае 5 брыгад з 10 комсамольцаў на вёску для правядзеньня працы па мобілізацыі срокаў насельніцтва праз ашчадкасы. Вылучаецца 10 комсамольцаў—агентаў ашчадкас для працы на сумяшчальнасьці на прадпрыемствах, ва ўстановах, колгасах і вёсках, дзе няма сталай ашчадкасы.

Узятыя Менскім Гаркомам абавязацельствы да многага абавязваюць усю організацыю.

Трэба адзначыць недапушчальныя адносіны комсамольскага колектыву з-ду „Бальшавік", які шэфствуе над ашчадкасамі. Ня гледзячы на катэгарычныя прапановы Гаркому, комсамольскі колектыў бязьдзейнічае ў галіне ўдзелу ў працы ашчадкас. Тры месяцы таму назад комсамолу Менску зьвярнуўся з адкрытым лістам да комсамольскага колектыву, але той да гэтага часу ўпарта маўчыць.

Менгарком павінен патрабаваць адказу ад комсамольскага колектыву зав. „Бальшавік" і прыняць меры да ажыцьцяўленьня сваёй пастановы.

ЦБ ЛКСМБ у сваёй тэлеграме ўсім райкомам папярэдзіў „што вынікі выкананьня фінпляну 1-га квартылу будуць для комсамольскай організацыі праверкай не ўменьня ўключыцца ў баявыя вучасткі гаспадарчага фронту".

Не парадный дэкларацыяй, а сыстэматычным, актыўным і практычным удзелам комсамолу ў развіцьці ашчадсправы дамо новыя мільёны на соцыялістычнае будаўніцтва.

Ш-іч.

Ганебныя лічбы прарыву

У Слуцку рэалізацыя пазыкі „пяцігодка—у 4 гады" ідзе марудна. Трэ' было рэалізаваць облігацый на суму 90 тысяч рублёў, а рэалізавана толькі на 35.122 рублі, што складае 39 проц.

Райколгассаюз і коопсаюз зусім слаба мобілізуюць сродкі. Улічваючы пабудову і вясеньнюю працу Слуцкай МТС, трэ' было рэалізаваць па Случчыне згодна пляну трактарных акцый на суму 10.300 руб., рэалізавана толькі на 347 руб., або 3,4 проц.

Аднаразовы збор ад аднаасобнага сэктару—беднякоў і серадвякоў—паступіў на суму 93,215 рублёў, а павінна быць 100.000 руб (выкананьне на 93,2 проц.). Ад кулакоў паступіла 11.025 руб., а павінна было паступіць 17.000.

Партыйна-комсамольскі і профсаюзны актыў раёну не мобілізаваўся на фронт ліквідацыі прарыву і выкананьня кантрольных лічбаў.

Брыгадзір „Ч.З." Ян Прыбытак

Выконваем дагавор

Расонская організацыя комсамолу склала соц. умову з райашчадкасай. Комсамольцы абавязаліся за гэты год завербаваць фізычных укладаў на суму 32.000 і 3000 укладчыкаў, распаўсюдзіць да 5 жвіўня пазыку „пяцігодка—у 4 гады" на суму 10 тысяч рублёў.

Кожная комсамольская ячэйка мае кантрольныя лічбы, якія ўжо пачалі выконваць.

Дрозд

Яму няма калі

„—У нас і так шмат пытаньвяў, —кажа сэкратар Вузьдзенскага РК ЛККМБ. Нам некалі займацца мобілізацыяй сродкаў.

Загадчыку райашчадкасы на паседжаньні бюро РК КСМ далі для дакладу.., тры хвіліны.

Кіруючы склад РК ня цікавіцца выкананьнем соц. умовы з украінскім комсамолам.

К-м.

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА — Лом дамо мартэнам

№ 1 | Бюлетэнь выдаецца праз 5 дзён | № 1

Экономія і штодзенны збор лому павінны даць краіне мільёны тон мэталю

(З пастановы прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і НК РСІ СССР)

Прэзыдыум ЦКК і колегія НК РСІ СССР прапанавалі ўсім аб'яднаньням, трэстам і прадпрыемствам на пазьней 1-га мая выявіць усё абсталяваньне, машынныя часткі і мэтальвырабы, якія не скарыстоўваюцца і безадкладна перадаць іх Рамонтмашыне (прыгодныя машыны і часткі), Стальзбыту (мэтальвырабы) і Мэтальлому (няпрыгоднае абсталяваньне, лом і г. д.)

За экономію мэталю і выяўленьне мэталюргічнага (асабліва каляровага лому) цэхі і паасобныя рабочыя павінны прэміявацца. Наркамзему СССР даручана распрацаваць мерапрыемствы па збору лому ў аграмаджаным сэктары сельскай гаспадаркі.

ЦКК РСІ рашыла прасіць УсеЦСПС паставіць перад профсаюзамі, як важнейшую задачу, пытаньне аб мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў мэталю. Для гэтага неабходна організоўваць лятучыя праверкі, суботнікі, брыгады па выяўленьню мэталюргічных адкідаў, шырока ўжываючы соц.спаборніцтва паміж паасобнымі прадпрыемствамі і цэхамі, высоўваючы сустрэчныя пляны па збору лому.

Збор мэталюргічнага лому і адкідаў павінен стаць штодзеннай задачай інжынэрна-тэхнічнай і рабочай грамадзкасьці прадпрыемстваў, саўгасаў, МТС і г. д.

Усім органам НК РСІ прапанавана ўзяць пад контроль выкананьне усіх дырэктыў партыі і ўраду па мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў мэтальпрамысловасьці.

БЯРЭМ ТЭМПЫ

БУШАЧЫ.—Вушацкія местачковыя (колгасная і кооперацыйная) комсамольскія ячэйкі абгаварылі пытаньне аб зборы мэтальлому і прыступілі да працы.

Організаваны брыгады з комсамольцаў і беспартыйных рабочых. За першы дзень брыгада з 10 асоб сабрала 867 кілёграм мэтальлому.

Уся праца праводзіцца на прынцыпах соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

Міхась Вербін.

Зьбіраем лом.

22 сакавіка—дзень звозу

ЛЁЗНА.—Збор жалезнага лому ў раёне праходзіць нездавальняюча. Большасьць комсамольскіх ячэек адносіцца да гэтага пытаньня—па апортуністычнаму. Зусім не прыцягнуты піонэрскія атрады і школы.

Толькі зараз РК КСМ абвясьціў месячнік падбору мэтальлому. Складзены брыгады, якія павінны за час гэтага месячніку сабраць увесь лом мартэнам.

Дзень 22 сакавіка абвешчан днём звозу ўсяго сабранага лому на станцыю.

К. Кароль.

ФРОНТ УСЕАБУЧУ ПРАРВАНЫ

Патрэбны рашучыя захады. Комсамол павінен бязьлітасна змагацца за ажыцьцяўленьне задач шэфства над усеабучам

Юнкораўская армія, разьвінайся ва ўсебеларускім рэйдзе!

Матар'ялы, якія ніжэй зьмешчаны, з усей сур'ёзнасьцю сьведчыць аб трывожным становішчы на фронце ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

У шэрагу месц усё яшче пануе опортуністычная недаацэнка ўсеабучу. Ні што іншае, як гэта, прымусіла ЦК ЛКСМБ пазбавіць Багушэўскі РК ЛКСМБ высокага званьня шэфа над усеабучам у раёне. Ні што іншае, як гэтая опортуністычная недаацэнка прывяла да глыбокіх прарываў і ў Наркомасьвеце, і ў Белкоапсаюзе і ў іншых організацыях і раёнах, аб якіх сёньня гавораць матар'ялы.

Там, дзе задачы ўсеабучу ўзьняты на прынцыповую політычную вышыню, дзэ вакол гэтых адказьнейшых задач мобілізавана ўвага шырокіх мас, дзе па-бальшавіцку праведзена „дэкада штурму", там мы маем бясспрэчныя дасягненьні (Полацак, Чэрвень).

Задачы ўсеабучу патрэбуюць мобілізаваць усю партыйную і савецкую грамадзкасьць, каб зрабіць неадкладны перелом.

Усеабуч патрабуе ад комсамольскай організацыі ўсебакова палепшыць шэфскую работу, узьняўшы яе тэмпы і стаўшы на шлях рашучай барацьбы з праявамі опортуністычнай недаацэнкі гэтай важнейшай справы.

„Чырвоназьменаўцы" павінны выступіць на фронт усеабучу, каб дапамагчы партыі комсамолу на гэтым вучастку клясавай барацьбы.

Сёньня мы клічам сваю юнкороўскую армію ў шэрагі культармейцаў, у шэрагі самаадданых барацьбітоў за краіну суцэльнай пісьменасьці.

ГРБАЧЭЎСКІ С-САВЕТ

Расонскі раён.

Раввал

...ырэктывы аб ўсеагульным навучаньні ня выкананы.

...эльсавет нічога ня робіць у гэтым ...амку. Уся праца ўскладзена на ...ы настаўнікаў.

...рофсаюзы таксама недаацанілі ...арнейшага політычнага значэнь... ўсеабучу. Упаўнаважаны саюзу, ...аўнік Варацінскай школы Ка...ркевіч, наўмысьля не пачынае ...цы на лікпункце, а няпісьменных у ...го школьным раёне да 20 асоб. У ...коле Караткевіч займаецца па ...іне-дзьве з перабоямі. Пра яго ...у на тэрыторыі сельсавету і ...рыць ня прыходзіцца,

...ельсавет ні разу не абгаварваў ...аньняў усеагульнага навучаньня і ...квідацыі няпісьменнасьці. Ма'...ялы, паданыя настаўнікамі некаторых школ аб ненаведваючых школы і лікпункты, ляжаць бяз руху цэлымі месяцамі. Лікпункты распадаюцца. Распачатае ў сельсавеце будаўніцтва школ не канчаецца. Вучні мерзнуць у школе. Сельсавет ведае аб гэтым.

Дырэктыва аб матар'яльным забясьпечаньні настаўніцтва ня выканана. Пра рабочае забясьпечаньне настаўнікаў у Рагачэўскім сельсавеце і не ўспамінаюць.

Комсамольскія ячэйкі гэтага сельсавету нічога практычнага не зрабілі, каб палепшыць становішча. У большасьці комсамольскія ячэйкі зусім не займаліся пытаньнем усеагульнага навучаньням і ліквідацыяй няпісьменнасьці.

БЕЛКООПСАЮЗ

Дырэктывы партыі ігноруюцца

...к забясьпечаны вучні гарачымі сьнеданьнямі і гарбатаю? З 83170 ...ольнікаў п'юць гарбату ў школе ...тулькі 56345 вучняў; з 40490 вуч...яў сьнедаюць 18259 вучняў альбо ...4 проц.

У кожнай школе павінна быць ...рбата і цукер. Але гэта далёка ня ...к. З 80 школ Халопеніцкага ра...ёну гарбата ўведзена ў 8 школах, ...Бабруйскім—з 200 школ—у 3-х, ...Азарыцкім з 52 школ толькі ў ...х. А Бешанковіцкі і Нараўлянскі РВК нават ня вылучылі фондаў на харчаваньне вучняў.

Стаўка на самацёк, злачынныя адносіны кооперацыйных організацый з Белкоопсаюзам на чале—вось чым тлумачацца гэтыя прарывы.

Рашучай барацьбу супроць опортуністычнай недаацэнкі ўсеабучу.



...— 45 проц. забясьпечана. ...і добра... ёсьць на што ...аперціся

НАРКОМАСЬВЕТЫ

МАСЫ НЕ МОБІЛІЗАВАНЫ

У пастанове ЦК УсеКП(б) адзначана: „разглядаць увядзеньне ўсеагульнага абавязковаганавучаная,як важнейшую політычную кампанію". Які-ж удзел у правядзеньні гэтай важнейшай кампаніі прымаюць органы Нарасьветы, як-жа кіраваў Наркомасьветы ажыцьцяўленьнем ўсеагульнага навучаньня?

Усе школы ў гарадох, а таксама і школы прымежныя з колгасамі, прымацаваны да пэўных прадпрыемстваў. колгасаў і саўгасаў. Шмат дзе політэхнізацыя далей гэтага папяровага прымацаваньня не пашла. На заводзе „Дрэваапрацоўшчык" майстры не растлумачвалі вучням працэсаў вытворчасьці.

У шэрагу месц інжынэрна-тэхнічныя сілы ніякага ўдзелу у політэхнізацыі ня прымаюць. Аграномы зусім не дапамагаюць школам колгаснай моладзі.

Наркомасьветы разаслаў па асьветніцкіх установах пэўныя дырэктывы аб рабочых пакоях, сьпісы неабходных політычных прылад для майстэрняў.

Згодна з пастановай ЦК УсеКП(б), былі створаны камісіі садзейнічаньня ўсеагульнаму навучаньню. Гэтыя камісіі, замест прыцягнуць да актыўнай барацьбы за ўсеабуч аддзелы народнай асьветы, профсаюзныя і гаспадарчыя організацыі,—бязьдзейнічаюць. Наркомасьветы дрэнна кіруе работай камісій.

Паводле пастановы ЦК, усеагульным пачатковым абавязковым навучаньнем павінны быць ахоплены дзеці ва ўзросьце 8—10 год. У БССР ахоп дзяцей гэтага узросту дасягнуў 98 проц.


Наркомасьветы склаў пляны па організацыі гурткоў і школ для пераросткаў, а програм ня склаў. З-за гэтага шмат дзе зрывецца навучаньне пераросткаў.

Дырэктыва ЦК аб організацыі саветаў культурнага будаўніцтва прырайвыканкомах ня выканана.

З мэтай вырашыць проблему кадраў, НКА даў ўказаньні ўкомплектаваць пэдкурсы і тэхнікумы. Каротка-тэрміновыя курсы пры 14 пэдтэхнікумах разьлічаны на 1300 чалавек.

Організуюцца дашкольныя курсы для 1500 асоб. Гэтым важнейшым мерапрыемствам па вырашэньню проблемы кадраў пагражае зрыў.

Гэта трофэі „шэфства" багушэўцаў



Просьба ня дзьмухаць...

Прыгавор фактаў

* У Барысаве пануе опортуністычная недаацэнка ўсеагульнага навучаньня. Райінспэктар адмовіўся праводзіць конфэрэнцыю па політэхнізацыі. Комсамольская організацыя стаіць у баку.

* ЦК ЛКСМБ зьняў шэфства над усеабучам з Багушэўскага РК ЛКСМБ. Даклад Багушэўскага РК ЛКСМБ заслухоўвалі тры разы на бюро ЦК ЛКСМБ.

Усеагульным навучаньнем ахоплена толькі 30 дзяцей. Уся работа па ўсеабучу праходзіць самапёкам.

* У Лепелі цэлы год праляжала партыя абутку ў 146 пар. Ня гледзячы на вострую патрэбу, абутак застаўся нескарыстаным.

* У саюзе швэйнікаў па ліквідацыі няпісьменнасьці правал. Толькі 20 проц. няпісьменных ахоплены лікпунктамі. На швэйнай фабрыцы „Кастрычнік" з 200 няпісьменных ахоплена толькі 17 чал. Культсэктар ЦСПСБ пасылаў на „Кастрычнік" 7 брыгад для дапамогі ў працы. Партыйная і комсамольская організацыі недаацэньваюць баявую задачу ліквідаваць няпісьменнасьць.

БЯРЭЦЕ З ІХ ПРЫКЛАД

* Комсамольская організацыя Полацкага раёну ўзорна разгарнула працу па правядзеньню ўсеагульнага навучаньня.

На вёску пасланы 14 брыгад, організаваны выхады культармейцаў. Да ўсёй работы прыцягнут Бэлпэдтэхнікум.

У большасьці школ ўведзены гарачыя сьнеданьні. Праведзены мітынгі вучнёўства, прысьвечаныя ўсеагульнаму навучаньню.

Лікпункты працуюць бесьперабойна.

* Комсамольскія ячэйкі Веткаўскага раёну актыўна змагаюцца за пасьпяховае ажыцьцяўленьне ўсеагульнага навучаньня. Там, дзе ёсьць комсамольскія ячэйкі, наведваньне лікпунктаў дасягае 80 проц., дзе ячэек няма—15-20 проц.

ЧЭРВЕНЬШЧЫНА

НЯ СПЫНЯЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

Калі праводзілася культ астафэта, а таксама дэкада штурму прарываў у галіне культбудаўніцтва комсамольская організацыя здолела мобілізаваць працоўную моладзь на ліквідацыю прарываў ва ўсеагульным навучаньні. Чэрвеньшчына мае ўжо значныя дасягненьні. Дзеці 8-11 гадовага ўзросту ахоплены школай на 100 проц., 1115 год на 95 проц. Усяго ў раёне дзяцей 8-10 гадовага ўзросту 2940, ахоплена школамі 2911, 29 дзяцей не ахоплена школамі з прычыны хваробы.

Усе школы забясьпечаны памяшканьнямі. У студзені 1931 году адкрыта 12 новых комплектаў, якія забясьпечаны настаўніцкім складам. Праца праходзіць бесьперабойна. Выкарыстаны ўсе сродкі, каб забясьпечыць бяднейшых вучняў.

Кооперацыя стаіць у баку. Школы не забясьпечаны сшыткамі, падручнікамі і інш., прывозілі бацінкі для дзяцей 3-4 гадовага ўзросту.

Абвяшчаем усебеларускі рэйд „Чырвоназьменаўцаў"

Опэрацыйнае заданьне ўдарным брыгадам, пастом і ўсім юнкорам „Чырвонай Зьмены"

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" з 15 сакавіка па 1-е лютага абвяшчае ўсебеларускі рэйд ударных брыгад, пастоў і ўсіх юнкораў „Ч. З." на фронт ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Юнкорбрыгады, пасты і ўсе юнкоры „Чырвонай Зьмены" павінны ў тэрміновым парадку дэталёва прапрацаваць пастановы ЦК УсеКП(б) ад 25 ліпеня 1930 г. і 21 лютага 1931 г., пастановы ўраду, ЦК УсеЛКСМ і ЦК ЛКСМБ аб ходзе ўсеагульнага пачатковага навучаньня, і з 15-га сакавіка да 1-га красавіка організаваць шырокую масавую праверку выкананьня гэтых пастаноў.

Об'ектамі рэйду павінны быць: камітэты і ячэйкі ЛКСМБ, райвыканкомы, сельсаветы, навучальныя ўстановы (тэхнікумы, школы, лікпункты), кооперацыя, РБ ДКО. Мы чакаем ад юнкораў матар'ялаў па наступных пытаньнях:

Як практычна ў штодзённай рабоце паасобныя комсамольскія організацыі і ячэйкі апраўдваюць высокае званьне шэфа над усеабучам іх удзел ва ўсіх мерапрыемствах усеабучу; ініцыятыва ячэек і вопыт іх работы. Пакажэце лепшыя ўзоры работы комсамольскіх ячэек, організацый, каб на гэтых узорах вучыць іншыя організацыі і ячэйкі самаадданай барацьбе на гэтым адказьнейшым вучастку культурнай рэволюцыі. Што робяць ячэйкі для мобілізацыі ў пэдагогічныя ўстановы і на курсы.

Як настаўніцтва і школы ажыцьцяўляюць задачы політэхнізацыі.

Хто і што перашкаджае гэтаму ажыцьцяўленьню. Якія конкрэтныя дасягненьні маюць піонэрорганізацыі і школы ў гэтай галіне. Ці прыцягнуты да актыўнага ўдзелу ў колектывізацыі інжынэрна-тэхнічныя сілы фабрык і заводаў. Як стаіць справа з політэхнізацыяй колгаснай дзетвары. Як організавана забясьпечаньне школ памяшканьнямі, абуткам, вопраткай, гарачымі сьнеданьнямі.

Як праходзіць выканапьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб неадкладнай організацыі саветаў культурнага будаўніцтва пры райвыканкомах. Як разгорнута праца з культармейцамі. Вынікі гэтае працы. Як організоўваюць працу саветы культурнага будаўніцтва.

Як органы Нарасьветы вырашаюць проблему настаўніцкіх кадраў. Падрыхтоўка і перападрыхтоўка гэтых кадраў.

Ахоп няпісьменных лікпунктамі, праца лікпунктаў, правядзеньне мерапрыемстваў для лепшай організацыі іх працы.

* *
*

Вось цэнтральныя пытаньні, над якімі павінны працаваць кожная брыгада, кожны юнкор у час усебеларускага рэйду „чырвоназьменаўцаў" па ўсеабучу і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Асаблівую увагу трэба зьвярнуць на тое, як выконваюцца на мясцох дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб тым, што „усю работу па ўсеабучу разгортваць на аснове адзінага пляну ўсіх організацый і масавага прымяненьня форм культпаходу (культпаход, культэстафэта і да т. п.)"

Мы чакаем ад арміі „чырвоназьменаўцаў" рапартоў аб іх актыўнай барацьбе на фронце ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

У правядзеньні першага рэйду па ўсеабучу, матар'ялы якога тут зьмешчаны, прымалі ўдзел ударныя брыгады „Чырвонай Зьмены" у складзе наступных таварышоў: Окунева С., Гурэвіча, С. Касьцянецкай, Яўсеева, Леўчанкі, Леткікава, Леськаўца, М. Ракіты, Шэвелева, Харытончыка і Зяневіча.

Змагацца за сьцяг X зьезду саветаў

Поўным выкананьнем плянаў контрактацыі, ільнанарыхтовак і вясновай сяўбы, пры яшчэ большым разгортваньні колгаснага прыліву—ажыцьцявім рашэньні X Усебеларускага Зьезду Саветаў

Прэзыдыум ЦВК аб рэалізацыі рашэньняў X усебеларускага зьезду саветаў

Прэзыдыум ЦВК БССР вызначыў шэраг конкрэтных мерапрыемстваў у выкананьне пастаноў X усебеларускага зьезду саветаў. Улічваючы вялізарнае політычнае і практычнае значэньне работы і пастаноў X усебеларускага зьезду саветаў, прэзыдыум ЦВК даручыў усім наркоматам і цэнтральным установам, райвыканкомам і саветам, а таксама зьвярнуўся з просьбай да ЦСПСБ шырока популярызаваць пастановы зьезду, увязаўшы гэту работу з мобілізацыяй мас на выкананьне прамфінпляну, далейшае разгортваньне суцэльнай колектывізацыі, на выкананьне усіх чарговых політычна-гаспадарчых кампаній, на організацыю соц. спаборніцтва і ўдарніцтва і г. д.

З мэтай шырокага скарыстаньня пастановы X усебеларускага зьезду саветаў аб устанаўленьні пераходнага сьцягу імя X усебеларускага зьезду саветаў для ўзнагароды раёну за лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай сяўбы і за організацыю колгасаў, распрацоўкі адпаведных практычных мерапрыемстваў і правядзеньня конкурсу створана камісія ў складзе т. т. Рачыцкага (старшыня), Гіляквіча і Міцькова.

Пра контрактацыю забылі

ЛАГОЙСК, 12 (па тэлефону) Комсамольская організацыя Лагойскага раёну на баявому ўключылася ў правядзеньне васеньняй пасеўкампаніі і колектывізацыі. Кожная ячэйка стварыла ініцыятыўныя групы з колгасьнікаў па вярбоўцы аднаасобнікаў у колгасы.

У апошнія дні сіламі комсамольскіх ячэек організаваны 2 колгасы „Полымя" і „8 Сакавіка". На сёньняшні дзень раён колектывізаваны на 40 проц.

Ячэйкамі вылучаны брыгады па ачыстцы насеньня ў колгасах. Так, Лагойская профячэйка ачысьціла насеньне ў колгасе „Бальшавік". У саўгасе „Слабодка" сіламі комсамольскай ячэйкі ачышчана 10,5 тон насеньня.

Аднак, трэба падкрэсьліць, што комсамольскія організацыі ў сваю штодзённую работу не ўключылі ажыцьцяўленьне плянаў контрактацыі.

Большасьць ячэек нават не абгаварылі пастановы партыі і ўраду па гэтаму пытаньню.

Х.

Давесьці справу да канца

Вушацкі раён гадовае заданьне па загатоўцы лёну ў 2500 цэнтнэраў выканаў толькі на 15 проц.

Некаторыя сельсаветы, як Кублічы, Чарапаўшчынск., Весьніцкі, давёўшы цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможных двароў, ня прынялі ніякіх захадаў, каб спагнаць іх.

Шэраг колгасаў (Леніна і інш.), па сёньня не апрацавалі лён з 3 дзесятках га.

Сарочынская, Старасельская, Мясьніцкая і іншыя ячэйкі пытаньня аб ільна-загатоўках нават не абгаварвалі на сваіх сходах.

Гінзбург.

„Чырвоная Зьмена" дапамагла

* На заметку „Трэба звольніць" Аршанская РайКК РСІ паведамляе, што кулак Залескі Сьцяпан выключан з Аршанскага тэкстыльнага тэхнікуму. Матар'ял накіраваны чарэйскаму п;акурору, каб прыцягнуць да адказнасьці сакратара сельсавету, які даў кулаку Залескаму няправільную даведку аб яго соцыяльным становішчы, дзякуючы якой Залескі пралез у навучальную ўстанову.

* Заметка „Самагон у разгары", па паведамленьні Бярэзінскай міліцыі, пасьля расьсьледваньня поўнасьцю пацьвердзілася. Віноватыя ў выгнаньні самагону прыцягнуты да адказнасьці па 149 арт. крым. кодэксу. Справа накіравана ў суд Бярэзінскага раёну.

* Адміністрацыйная частка Веткаўскага раёну паведамляе, што заметка „Колькі каштуе праліцая кроў жанчыны" цалкам пацьвердзілася. Хуліганы выкрыты і аддадзены пад суд.

* На заметку „Пад суд шкоднікаў", Шклоўская РайКК РСІ паведамляе, што расьсьледаваныя факты поўнасьцю пацьвердзіліся. Старшыня колгасу—Галаванава—выключана з радоў партыі. Справа колгасу „Гарадок" перадана ў суд.

Распаўсюдзілі на 5000 руб. трактарных акцый

Для правядзеньня вясеньняй пасеўкампаніі Вушацкі райком комсамолу мобілізаваў 20 комсамольцаў, якія выехалі на месяц у вёскі раёну. Брыгада, якая выехала ў Гарадоцкі сельсавет, разам з комсамольскай ячэйкай організавала дзьве брыгады па рамонту інвэнтара і ачыстцы насеньня.

Вушацкая колгасная ячэйка дапамагла колгасу „Пролетары" ачысьціць усё насеньне і скласьці вытворчы плян.

Раённая і комсамольская організацыя выканала свой абавязак па распаўсюджваньню трактарных акцый на суму 5000 рублёў.

Брыгада „Ч. З."—Гінзбург, Ліпаўка

Набліжаецца справаздачна-перавыбарчая кампанія сыстэмы прамкооперацыі

Сустрэць яе ва ўзброеньні

Набліжаецца справаздачна-перавыбарчая кампанія кіруючых органаў прамкооперацыі. Перавыбары ў гэтым годзе набываюць асаблівае важнае грамадзка-політычнае значэньне, бо яны павінны перарасьці ў шырокі агляд і самаправерку работы усіх зьвеньняў сыстэмы прамкооперацыі пад пунктам погляду выкананьня ў прамфінпляну дзейнасьці рашэньняў партыі і ўраду.

Моладзь прамкооперацыі пад кіраўніцтвам комсамолу зьдзейсьніла ў асноўным паварот тварам да задач гаспадарчага будаўніцтва. У органах кіраўніцтва і кантролю расьце яе актыўнасьць і ініцыятыва і гэта выражаецца ў актыўнай барацьбе за разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва, выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Ня гледзячы на гэта, з боку асобных раённых саюзаў назіраецца і ёсьць недаацэнка ролі моладзі ўва ўсёй сыстэме і яе коопэраваньні. Вынікам гэтага зьяўляецца прарыў за асобны квартал у выкананьні кантрольных лічбаў па коопэраваньню моладзі—замест пляновых 18,2 проц. выканана 15 пр.

Перавыбарчая кампанія павінна быць скарыстана для яшчэ большай мобілізацыі увагі моладзі на ліквідацыю прарыву ў коопэраваньні моладзі за асобны квартал. Гэта кампанія павінна зьявіцца праверкай працы сярод моладзі і ўдзелу апошняй у гаспадарчай дзейнасьці сыстэмы.

У сувязі з гэтым павінна заразжа разгарнуцца падрыхтоўка да правядзеньня перавыбараў з тым, каб моладзь магла прысьці сваімі поўнымі прапановамі і думкамі, магла на далейшы час уаясца за ліквідацыю прарываў і барацьбу за лепшую прапрацоўку працы.

Раённыя саюзы павінны зараз-жа пачаць падрыхтоўку і організацыю сходаў і конфэрэнцый моладзі, прыцягваючы да іх некооперованую соматужную моладзь. На гэтых сходах павінны быць выпрацаваны наказы ад моладзі новаму складу праўленьня па пытаньнях масавааканамічнай працы сярод моладзі, пераходу да індывідуальнага навучаньня да організацыі школ, самастужкага вучнёўства тыпу ФЗВ, па організацыі бытавых комун моладзі, забесьпячэньню інвэнтаром і г. д.

Аднача ява ў гэтым неабходна будзе, каб саюзы скліканні спэцыяльныя нарады моладзі, чаленў праўленьня і рэўкамісіі па пытаньню ўдзелу ўдзелу моладзі ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Асаблівую працу неабходна будзе правесьці па падрыхтоўцы да перавыбарчай кампаніі сярод рабочай моладзі нацменшасьцяй, паставіўшы, як задачу праверку інтэрнацыянальнага выхаваньня з тым, каб гэтай праверкай даць штуршок для далейшага больш упартага правядзеньня ленінскай нацыянальнай політыкі. Гэта праца павінна быць праведзена з найлепшай падрыхтоўкай і пастаўлена як баявая задача для ўсёй моладзі сыстэмы прамкооперацыі.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія будзе баявой праверкай таго, наколькі комсамол і рабочая моладзь праводзяць у жыцьцё рашэньні комсамольскіх зьездаў у справе паглыбленьня павароту тварам да вытворчасьці і разгортваньня далейшай працы ў гэтай галіне.

Галкін.

Паведамленьні

„Культпроп ЦК КП(б)Б паведамляе ўсіх жадаючых паступіць у Маскоўскі Комуністычны Інстытут Журналістыкі, што тэрмін падачы заяў у ЦК працягнуты да 20 сакавіка (жадаючыя павінны тэрмінова падаць праз райкомы, ячэйкі адпаве;ныя дакуманты).

***

Сьпіс таварышоў, вылучаных Мен. Гар. КК КП(б)Б для правядзеньня дакладаў аб рабочым шэфстве над дзяржапаратам (даклады правесьці на працягу месячніка па рабочаму шэфству).

Ад ЦКК КП(б)Б:—Эпштэйн—ф-ка Акцябр, Жукаў—з-д Камунар, Косьцераў—дрэваапрацоўшчык, Касьцюкевіч—Энэргія, Каршаковіч—з-д Бальшавік, Пляцюкеў—з-д Пролетары, Гершман—Абутковая ф-ка, Жук—Эльвод, Вярба—друкарня імя Сталіна, Аляксееў—чыгунка, Стэфановіч—Комунарка, Федарэнка—Хэмфармзавод, Зубаў—Полымя Рэволюцыі, Якубсон—Чырвоная зорка, Касаеў—Бойня.

Ад Гар. КК КП(б)Б:—Кеніг—Хлебазавод, Фрыдман—рэдакц. „Рабочий" і „Зьвязда", Вішнеўская—рымарная ф-ка, Шкірыч—Абутковая майстэрня, Лійц—Лямцавая ф-ка, Палей—мясцком грузчыкаў, Плешакоў (ЦСПСБ)—з-д Беларусь, Плятнёў (ЦП СГС)—з-д Ударнік, Юдэльсон (НКЮ)—рымарня ф-ка, Майзіт (ЦВК)—ф-ка Беларуска, Хонік (Нарсувязь)—ф ка 8-га сакавіка, Кавалёў (ЦП Будаўнікоў)—Шпалерная ф-ка, Васільеў (ВСНГ)—Шчаціннная ф-ка, Рэутовіч (з-д Бальшавік)—Чырвоны тэкстыльшчык, Цімошчанка (Комвуз)—ф-ка ім. Крупскай, Вайнэровіч (ф-ка Комунарка)—Калбасная ф-ка.

Прапануецца усім сэкратарам парт. колектываў і ячэек КП(б)Б дамовіцца з дакладчыкамі аб правядзеньні сходу. Матар'ял для дакладаў атрымаць у Гар. КК.

Ліст з Чыкаго (ПАЗШ)

ЗАПІСКІ БЕСПРАЦОЎНАГА

„Раскошная" вячэра на семярых

4 лютага

—Калі хто-небудзь думае, што нэгры Мак-Іспорта жывуць, як ў ра;, няхай ён прачытае гэта.

Большасьць нэгрыцянскіх сем'яў туляцца ў бяднейшым квартале Мак-Іспорта на Джэром-Стрыт. Разносячы лістоўкі аб дэмонстрацыі, я зайшоў у адзін дом. Там шасьцёра сядзелі ля печы і палілі мокрую паперу. Агонь не распальваўся. 4 дзяцей былі без бацінак. Ні газы, ні электрычнасьці, ні нават газавай лямпы.

Я даў старэйшаму лістоўку аб нашай дэмонстрацыі, прызначанай на 10 лютага. Ён прачытаў і запытаў мяне:

— Скажэце, чаму такі крызіс ў гэтай багатай краіне і чаму нэгры церпяць больш за ўсіх?

Пасьля таго, як я расказаў яму, ён абяцаў пайсьці на дэмонстрацыю.

У другім доме, куды я зайшоў, было семера каля стала. Яны елі, усе семера, 4 бульбы. Я-б не паверыў гэтаму, бо іх талеркі былі напалову поўныя. Матка сказала; а я расьцерла бульбу і прыбавіла крыху мукі, к б вышла болей і каб кожнаму прышлося нешта зьесьці.

Кухня была так мала, што, калі-б яшчэ хто-нерудзь паспрабаваў увайсьці—ён ня змог-бы.


Мноства нэграў ня маюць работы ня толькі на Джэром-Стрыце, але і ў іншых частках гораду. Усе яны гавораць: нешта трэба рабіць. Ім ня прыходліцца доўга тлумачыць аб тым, што трэба організоўвацца.

Прамова аднаго нэгра, якую я чуў

Я бачыў, як пасьля дэмонстрацыі беспрацоўных у Чарлоце сотні нэграў і белых былі занадта ўсхваляваны, каб разыйсьціся. Яны падышлі да памяшкаавьня Лігі Профсаюзнага Адзінства і там наладзілі другі сход.

Адзін стары нэгр—рабочы выступіў і сказаў:

„Я галодны як чорт, я ледзь гавару. Мне чартоўскі холадна, я дрыжу. Я ніколі ня еў дасыта і не апранаўся як належыць за ўсе 62 гады, і мне гэта абрыдла. Бязумоўна, было дрэнна, але цяпер куды горш. Мне робіцца млосна ад гэтых памыяў. Мэр-Вільсон—ёп есьць маю страву. Мы, рабочыя, будзем біцца за тое, што нам патрэбна. Мы будзем біцца разам. Я хачу сказаць, што я комуністы і чартоўскі добры комуністы. Рабочыя, якія хочуць змагацца за тое, што ім патрэбна, павінны далучыцца да нас".



Растуць гіганты смерці

Мае спатканьне з гарадзкім чыноўнікам

6 лютага. Я хаджу ад дому к дому і зьбіраю подпісы пад патрабаваньне аб страхаваньні беспрацоўных. Муніцыпаліт будуе дамбу, дзе працуе 13 ці 14 беспрацоўных. Я падышоў да іх і сказаў: „Хлопцы, даёш подпісы за страхаваньне беспрацоўных!" і расказаў ім, у чым справа. Бязумоўна, яны падпісалі.

У гэты час адзін з гарадзкіх чыноўнікаў убачыў, што рабочыя падпісваюць. Ён паглядзеў на ліст і закрычаў: „Як вы асьмельваецеся патрабаваць ад ураду! Ці ведаеце, што гэта значыць?" Я сказаў: „Ведаю".

Ём працягваў: „Патрабаваць гэта азначае, што калі вы не атрымаеце, чаго вы хочаце, тады вы возьмеце сілай!"

І ён доўга расьпякаў гэтых людзей, бо (казаў ён) „добрыя грамадзяне не павінны патрабаваць чаго-б там ні было ад ураду".

Забойства за 10 цэнтаў

8 лютага. Учора беспрацоўны нэгр паспрабаваў узяць з возу пару хлябоў. Ён быў застрэлен гарадзкім шпікам і памёр праз некалькі гадзін. Так,—добра ахоўваюць 10 цэнтавую прыватную уласнасьць!

Чаму-ж яны нічога ня робяць для дапамогі галодным?

Учора-ж малады рабочы быў выкінуты з расторану, бо ён ня мог заплаціць за зьедзенае. Яго скінулі з лесьвіцы і ён так пакалечыўся, што прышлося адправіць яго ў больніцу. Савет беспрацоўных адразу-ж сабраў многа рабочых і паставіў пікеты каля рэсторану. На дзьверах рэсторану красуецца шыльда: „Рэсторан Джыма ніколі не зачыняецца". Але калі мы дэмонстравалі, рэсторан быў зачынены, прынамсі на адзін дзень!

Што я бачыў на падземнай дарозе

9 лютага, Была вельмі халодная сьнежаньская раніца, калі я ішоў дамоў з сходу ў Ніжнім горадзе. Мне трэба было перасесьці на 125-й падземнай станцыі. Я шпацыраваў па пляцформе туды і назад, каб сагрэцца.

Відовіска, якое я бачыў, магло прымусіць задрыжэць усякага, у каго ў жылах цячэ чырвоная кроў. Белыя і чорныя ў лахманох, у парваных чаравіках, без панчох, без паліто, у шапках, насунутых на вушы, зьбіўшыхся ў кучу, спалі на лаўках станцыі.

А я вось што хацеў сказаць гэтым людзям на лаўцы:

„Хлопцы, прачнецеся! Няма чаго ляжаць тут на холадзе і выклікаць літасьць. Устаньце, як людзі ў адзін рад, рука аб руку—у рады комуністычнай партыі, адзінай партыі, якая змагаецца за вашы чалавечыя правы, за ваш хлеб і прытулак. Паконччым з прычынай гэтай ганьбы—з капіталістымі.

ФРАНК ХІЛЛ.

Адказны рэдактар—МІХ. ПЛАТАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599